**Коммуникативная** компетенция: принципы, методы, приемы
К63 формирования: Сб. науч. ст. / Под ред. Л. А. Муриной,
Ф. М. Литвинко. – Мн.: РИВШ БГУ, 2005. – Вып. 7. – 69 с.

*І. М. Саматыя*

# ПРАБЛЕМА СТВАРЭННЯ РАЗВІЦЦЁВАГА МАЎЛЕНЧАГА АСЯРОДДЗЯ ПРЫ НАВУЧАННІ БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ

Апора на маўленчую інтуіцыю (моўную чуйнасць) – адзін з галоўных прынцыпаў навучання роднай мове [1,2,3 і інш.]. Моўная чуйнасць – гэта разуменне таго, калі якія сродкі мовы могуць быць скарыстаны для выказвання думкі ці пачуцця. Развіццё асобы – духоўна-маральнае, эстэтычнае – у вялікай ступені залежыць ад маўленчага асяроддзя. Развіццёвы патэнцыял яго становіцца аптымальным тады, калі выкарыстоўваюцца вучэбныя сродкі, што актывізуюць і развіццё высокіх эмоцый, забяспечваюць паўнавартаснае развіццё асобы школьніка.

Метадычным сродкам, які з’яўляецца асновай стварэння на ўроках беларускай мовы не толькі навучальнага, але і развіццёвага маўленчага асяроддзя, з’яўляецца тэкст. Паколькі тэкст – гэта «мова ў дзеянні», то яго выкарыстанне дае магчымасць ствараць натуральнае маўленчае асяроддзе, дазваляе нязмушана ўключаць вучняў у сітуацыю зносін.

Назіранні ў працэсе аналізу тэксту над абумоўленасцю значэння слова, яго сувязямі з іншымі словамі, над узаемадзеяннем слова і кантэксту садзейнічаюць выхаванню моўнай чуйнасці, якая праяўляецца, па словах Л. У. Шчэрбы, «ва ўменні ствараць новыя кантэксты, ва ўменні адрозніваць магчымыя кантэксты ад немагчымых».

У тэксце функцыянуюць адзінкі розных узроўняў, таму, выкарыстоўваючы тэкст у якасці дыдактычнага матэрыялу на ўроках мовы, атрымліваем магчымасць фарміраваць у школьнікаў паняцце моўнай сістэмы, паказваць прыгажосць і гармонію гэтай сістэмы. Сістэмнасць мовы садзейнічае камунікацыі.

Дзіця, адчуваючы патрэбу ў зносінах, само робіць адкрыццё і фарміруе ў сваёй памяці сістэму мовы, патрэбную для адпаведнай перадачы задумы, сэнсу, і распазнае, атаясамлівае моўныя адзінкі пры іх успрыманні. «Саманавучанне» мове адбываецца ў працэсе зносін, а таму залежыць ад маўленчага асяроддзя. Іменна тое, што дзіця неўсвядомлена засвойвае, і з’яўляецца асновай моўнай чуйнасці, інтуітыўнага авалодання моўнай сістэмай.

Інтуітыўнае адчуванне сістэмнасці мовы пераходзіць у свядомае ўспрыманне цэласнасці моўнай сістэмы пры вывучэнні роднай мовы ў школе: лінгвістычныя веды становяцца інструментам для фарміравання ўменняў і навыкаў. Работа з тэкстам дазваляе навучаць не толькі на аснове падражання ўзорам, але і на аснове «саманавучання», што паступова прыводзіць да фарміравання моўнай асобы, здольнай выказаць свае думкі,

пачуцці ў слове. Прычым гэтае выражэнне адбываецца па-свойму, адлюстроўваючы непаўторнасць свайго характару, унутранага свету.

Тэкст можа стаць асновай стварэння нязмушанага развіццёвага маўленчага асяроддзя тады, калі будзе магчымы палілог (суразмоўніцтва), актыўным удзельнікам якога стане кожны вучань. Атмасфера сумеснай творчай дзейнасці настаўніка і вучня абуджае цікавасць школьнікаў да работы з тэкстам. Паступова яна набудзе даследчы характар. Гэта вызначаецца тым, я к і я іменна заданні будуць прапанаваны да тэксту, я к сфармуляваны, у якой п а с л я д о ў н а с ц і яны будуць выконвацца. Пры гэтым вельмі важна, каб школьнікі **разумелі**, чаму выконваюцца іменна такія заданні. Паступова яны павінны пераконваюцца ў тым, што даследаванне асаблівасцей ўжывання моўных сродкаў у тэксце як маўленчым творы дапамагае ім больш глыбока зразумець змест тэксту, задуму аўтара.

Такім чынам, можна зрабіць вывад, што а д б о р т э к с т а ў і з а д а н н я ў, уключэнне кожнага ўрока ў прадуманую с і с т э м у п р а ц ы – тыя ўмовы, якія ствараюць асяроддзе, у аснове якога ўдасканаленне, развіццё м о ў н а й ч у й н а с ц і (моўнай інтуіцыі). І адпаведна, становіцца вельмі важным метадычна правільны адбор тэкстаў і фармулёўка заданняў да іх.

З пункту погляду з м е с т у, лічаць многія метадысты [4, с. 4], вельмі важна аналізаваць тэксты аб мове, пра слова, пра небходнасць беражлівага стаўлення да мовы і слова, пра асаблівасці працэсу стварэння і ўспрымання мастацкага твора як віду дзейнасці. Асабліва гэта важна ў нашай сітуацыі – неразумення многімі жыхарамі нашай краіны ролі роднай мовы ў жыцці грамадства. І, што яшчэ больш важна на нашу думку, тэксты павінны быць даступнымі, пераканальнымі, яркімі і запамінальнымі.

Само сабой зразумела, што такія тэксты выкарыстоўваюцца побач з тэкстамі іншай тэматыкі: пра культуру памяці, пра адносіны да мінулага, цяперашняга і будучага, пра нацыянальныя традыцыі, пра экалогію і іншыя праблемы сучаснасці, пра ўсё тое, што ўплывае на духоўнае, маральнае развіццё асобы. І, як мы ўжо адзначалі, асаблівасцю тэксту, які выкарыстоўваецца на ўроку, павінна быць яго эмацыянальнае гучанне. Для сучаснага вучня асабліва важнымі павінны стаць тэксты, якія выклікаюць светлыя, добрыя пачуцці, якія дазволяць дасягнуць гармоніі з акаляючым светам, дапамогуць сфарміраваць аптымістычны светапогляд.

Наступны крытэрый, якім неабходна кіравацца пры адборы тэкстаў, – гэта м а г ч ы м а с ц ь а ж ы ц ц я ў л е н н я н а а с н о в е т э к с т у ф у н к ц ы я н а л ь н а г а п а д ы х о д у да вывучэння моўных з’яваў. На ўроку засваення новых ведаў работа з тэкстам дае вучням магчымасць атрымаць адказ на пытанне, якую ролю выконвае вывучаемая катэгорыя ў маўленні, таму што кожны тэкст з’яўляецца канкрэтным праяўленнем маўленчай дзейнасці.

Каб забяспечыць цэласнасць успрымання тэксту як маўленчага твора, разуменне вучнямі тэксту як складанага арганізма, у якім узаемадзейнічаюць сродкі усіх узроўняў моўнай сістэмы (фанетычныя, лексічныя, граматычныя),

спасцігненне таго, што іменна дзякуючы іх узаемадзеянню дасягаецца адзінства, звязнасць і маналітнасць, уласцівыя сапраўды творчаму тэксту, вельмі важна вызначаць характар і паслядоўнасць выканання заданняў да тэксту.

Тэкст служыць пацверджаннем думкі аб тым, што ўся моўная сістэма гарманічная і прыгожая, што ў маўленні (у тэксце) усе моўныя адзінкі ўзаемадзейнічаюць. Праца з тэкстам стварае рэальныя ўмовы для рэалізацыі ўнутрыпрадметных (міжузроўневых) сувязей.

### *Літаратура*

1. *Федоренко Л. П.* Закономерности усвоения родной речи. М., 1984.
2. *Протчанка В. У.* Роднае слова – крыніца развіцця асобы, духоўнасці народа // Адукацыя і выхаванне. 1994. №12. С.62–65.
3. *Яленскі М. Г.* Лінгвадыдактычная парадыгма асобасна арыентаванага навучання мове ў сучаснай школе. Мн., 2002.
4. *Пахнова Т. М.* Текст как основа создания на уроках русского языка развивающей среды // Русский язык в школе. 2000. №4. С. 4.